Таким образом, в современных ситуациях многомерного диалога, определяющего способы существования культуры и образованного человека в мире культуры, эпицентром измерения становится духовная безопасность как система проектируемых условий, позволяющая обществу изобразительно транслировать жизненно важные установки с учетом сложившихся и принятых идей, норм, способствуя переориентации социального сознания, ценностных смыслов с материальных на духовные, гуманистические [1; 3]. Изобразительно проектируемые смыслы гарантируют выдвижение жизненноценных задач культурного характера с учетом художественно-творческого опыта прошлого, для настоящего и во имя будущего, стимулируя аспекты культуроосвоения и культуросозидания в образно-смысловой интеграции науки и искусства.

**Литература и источники**


1. Балакина, Е. И. Культура народа – здоровье общества : монография / Е. И. Балакина. – Барнаул : ИП Колмогоров И. А., 2019. – 313 с.

2. Запесоцкий, А. С. Образование: философия, культурология, политика / А. С. Запесоцкий. – М. : Наука, 2001. – 443 с.

3. Каган, М. С. Введение в историю мировой культуры / М. С. Каган. – СПб. : Петрополис, 2003. – 368 с.

4. Мелик-Пашаев, А. А. О состоянии и возможностях художественного образования / А. А. Мелик-Пашаев // Искусство в школе. – 2008. – № 1. – С. 4-9.

5. Михайленок, О. М. Гуманитарная культура как фактор национальной безопасности / О. М. Михайленок // Россия реформирующаяся. – 2010. – № 9. – С. 108–122.

6. Печко, Л. П. Выразительность эстетики природы и культура личности : монография / Л. П. Печко. – Ульяновск ; Москва : ФАО Ульянов. гос. техн. ун-т, 2008. – 363 с.

7. Стёпин, В. С. Цивилизация и культура / В. С. Стёпин. – СПб. : СПбГУП, 2011. – 408 с.


# ПАКАЛЕННЕ Z І ПРАБЛЕМА ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ


*А. Э. Рудкоўская*


Прынцыпы геапалітычнага супрацьстаяння падразумяваюць у тым ліку неабходнасць псіхалагічнага злому насельніцтва праціўніка, абясцэньвання традыцый, разрыва сувязі пакаленняў праз непрыманне вопыту старэйшых. У гэтай сувязі вельмі актуальным і апраўданым уяўляецца ўдакладненне ў арт. 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адказнасці дзяржавы за захаванне не проста гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, але «гістарычнай праўды і памяці аб геранічным

подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» [1, с. 7]. Аслабленая гістарычная памяць будзе не здольная супраціўляцца выцясненню традыцыйных каштоўнасцей чужымі, злому нацыянальнай ідэнтычнасці, навязванню «правільнай» версіі гістарычнага мінулага.

У чым бачацца перашкоды, неспрыяльныя фактары, якія ўскладняюць рэалізацыю задач, выкладзеных у Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гг.?

1. Складванне ў моладзі новых сэнсавых канструктаў, на наш погляд, дакладна ўкладваецца ў тэорыю амерыканскага антраполага, этнографа М. Мід, якая прасачыла пераход ад постфігуратыўнай культуры да кофігуратыўнай, а пасля – прэфігуратыўнай. У першым выпадку старэйшае пакаленне выступае ў якасці бездакорнага аўтарытэту, прыкладу для пераймання; яго вопыт, каштоўнасці, стыль жыцця задаюць аўтаматызм паводзін дзяцей. У другім выпадку мы маем справу з канфліктам пакаленняў, калі моладзь не мае патрэбы ў пакаленні дзядоў, бо лічыць вопыт старэйшых недастатковым (а то і непрыдатным); арыентуецца на аднагодкаў і шукае новыя эталоны, ідэалы, спосабы жыццядзейнасці і самасцвярджэння. Па прагнозах даследчыка, у будучыні зварот да вопыту мінулага, узаемадзеянне пакаленняў стане яшчэ больш дыскрэтным, нетрывалым з прычыны інтэнсіфікацыі грамадскіх трансфармацый, паскарэння тэмпаў развіцця. Як кажуць, не дзеці жывуць у наш час, а мы – у іх часе. Сярод фактараў, якія прадуцыруюць падобныя тэндэнцыі ў духоўнай культуры, можна назваць кардынальныя сацыяльна-палітычныя, эканамічныя змены, тэхнічныя навацыі.

2. Пакаленне Z, – па словах М. Прэнскі, – «лічбавыя абарыгены», у найбольшай ступені схільныя да ўплыву віртуальнага медыяасяродзя, сацыяльных сетак. Гэта тоіць у сабе мноства рызык. Па-першае, кібернетычны чалавек засяроджваецца на ўласных інтарэсах, фантомнай рэальнасці і выключаецца з сапраўднага жыцця, сферы грамадскіх ідэалаў, сацыяльных сувязяў. Э. Фром назваў такога аўтычнага чалавека хворай асобай хворага свету. Па-другое, у сетцы кожны сам сабе гісторык, які размяшчае далёкія ад навуковай верыфікацыі пасты, каментары. Накручаныя лайкі і колькасць праглядаў уплываюць на цікавасць аўдыторыі да размешчанага матэрыялу, што становіцца інструментам кіравання стаўленнем людзей да падзей мінулага. Маладыя людзі не заўсёды ўмеюць аддзяляць збожжа ад пустазелля, фільтраваць кантэнт. Па-трэцяе, кола пытанняў, якія цікавяць моладзь, досыць вузкае, юнакі звяртаюць увагу, як казаў П. Сарокін, толькі на «пустыя банальнасці, яркія і шкодныя забавы і нетрывалы "поспех"» [2]. Па-чацвёртае, суб'екты інтэрнэт-прасторы становяцца лідэрамі меркаванняў для моладзі, канкурыруюць за аўтарытэт з педагогамі і бацькамі.

3. Па кан'юнктурных матывах асобных палітычных сіл бітвы за гісторыю рэзка абвастрыліся. Безадказная і безапеляцыйная інтэрпрэтацыя

падзей мінулага, этычная і аргументацыйная раскаванасць у ацэнках, распаўсюджванне канфліктагенных тэкстаў, дэзінфармацыя і дыскрэдытацыя, падробка і фальсіфікацыя, выбіральнасць адбору інфармацыі і аднабаковасць яе падачы сталі звыклымі сугестыўнымі, маніпулятыўнымі практыкамі ў справе светамадэлявання. Маладым людзям складана разабрацца ў падобным інфармацыйным хаосе, што правакуе скепсіс, ідэалагічную індыферэнтнасць, страту цікавасці да гістарычнай праблематыцы.

4. Перашкодай на шляху фарміравання гістарычнай памяці, патрыятызму выступае таксама агульная ментальная спецыфіка эпохі постмадэрнізму. Постсучаснаму свету са мноствам рызык стала ўласціва адсутнасць бяспекі ва ўсіх сэнсах. У постмадэрнісцкай культуры нігілізму дзейнічаюць гнуткія правілы, культура адмены. Грамадскае выцясняецца індывідуальным, гістарычнасць – папуры звестак пра мінулае, аўтарытэты – дэкананізацыяй традыцыйных каштоўнасцей, знакаў і герояў, сістэматычнасць ведаў – мазаічнай інфармацыяй, змест – формай, этычныя прынцыпы – геданізмам, гісторыка-сацыякультурная ідэнтычнасць – нежаданнем змяшчаць сябе ў якую-небудзь ідэнтыфікацыйную матрыцу. У выніку культ свабоды выбару, разнастайнасці і радапалажэння выліліся, на думку філосафа Ю. Харына, у нараджэнне новай з'явы, – хома цвішэнс – дэзарыентаванага, няўпэўненага чалавека «міжбыцця», абцяжаранага выбарам паміж мноствам варыянтаў; існуючага па прынцыпу дэ-: дэгуманізацыі, дэцэнтрацыі, дэрацыяналізацыі, дэфармацыі, дэструкцыі.

Але чалавек як істота, якая патрабуе сэнсу, не можа бясконца знаходзіцца ў стане нявызначанасці на ростанях, не можа без укаранення ў гістарычным, маральным субстраце: перакаці-поле – усё ж выключэнне. Дзяржаве варта і далей праводзіць адказную палітыку памяці для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, умацавання інтэграцыі і адзінства грамадства. Названыя рызыкі павінны падштурхнуць суб'ектаў сацыялізацыі да інтэнсіфікацыі работы па супрацьдзеянні дэструктыўнаму інфармацыйнаму ўплыву, пошуку новых форм узаемадзеяння з моладдзю ў мэтах яе сацыякультурнай інтэграцыі.

## Літаратура і крыніцы

1. Конституция Республики Беларусь (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г., 17 октября 2004 г., 27 февраля 2022 г.). – Минск : Национальн. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2022. – 80 с.

2. Сорокин, П. А. Долгий путь: Автобиогр. роман / П. А. Сорокин ; пер. с англ. П. П. Кротова, А. В. Липского. – Сыктывкар : Союз Журналистов Коми АССР : Шыпас, 1991. – 304 с.